# МОЎНЫЯ СРОДКІ СТВАРЭННЯ ГУКАВОГА ФОНУ АПАВЯДАННЯ Ў ТВОРАХ ЯНКІ БРЫЛЯ

**С.В. Ларыёнава**

У кожным з мастацкіх твораў малюнкі аб'ектыўнай рэчаіснасці перадаюцца па-рознаму. У жывапісу – у колерах, у музыцы – у гуках, а ў літаратуры, безумоўна, словамі.

Аднак, словамі можна перадаць і колеры, і гукі. Асабліва ярка гэта выражаецца ў творах мастацкай літаратуры.

Мастацкі стыль у стылістычнай сістэме мовы займае асобнае месца, паколькі мова мастацкага твора выконвае не толькі камунікатыўную, але і эстэтычную функцыю.

Мэтай нашага аналізу з'яўляецца выяўленне моўных сродкаў стварэння гукавога фону апавяданняў у мастацкім стылі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У "Зборы твораў" Я.Брыля ў 3-х тамах мы выявілі 242 адзінкі, якія адлюстроўваюць гукавы фон.

У асноўным яны прадстаўлены дзеясловамі – 174 адзінкі, а таксама назоўнікамі – 37, гукаперайманнямі – 22, выклічнікамі – 5, дзеепрыслоўямі – 2. У асобную групу можна вылучыць словазлучэнні – 2 адзінкі.

Паколькі група дзеясловаў самая вялікая па колькасці, то мэтазгодна прааналізаваць яе.

У стылістычных адносінах дадзеныя дзеясловы падзяляюцца на 2 групы:

Літаратурна-кніжныя:

– **Заплакаць.** – *...Жанчына заплакала і лягла.* [т. I, с. 19].

Размоўныя:

– **Галаганіць** [размаўляць ціха, нудна]... *Побач са мной галаганіць сусед.* [Т. 1, с. 547.].

Паколькі пераноснае значэнне дзеяслова звычайна выяўляецца толькі ў кантэксце, мэтазгодна вылучыць гэтыя лексемы ў пэўныя лексіка-семантычныя групы:

1. Дзеясловы, якія называюць маўленне чалавека:

– **Агрызнуцца** [адказаць злосна]... *Што, не праўда? – агрызнуўся Лапінка.* [Т.1, с. 48].

2. Гукі жывёл:

– **Біць** [спяваць]. ... *Б`юць перапёлкі.* [Т. 2. с. 422].

3. Гукі прыродных з`яў:

– **Бубніць** [стукаць]. ... *[Дождж] бубніць па блясе даху...* [Т. 1, с. 324].

4. Гукі, якія ўтвараюць пэўныя прадметы:

– **Скрыпець** [выдаваць скрыпучыя гукі]. ...*Сям-там скрыпеў журавель...* [Т.1, с. 46.].

Лексічныя адзінкі, якія ўтвараюць гукавы фон мастацкага апавядання, падзяляюцца на некалькі груп паводле абазначэння інтэнсіўнасці гучання:

Дзеясловы, якія перадаюць самае моцнае гучанне:

– **Зарагатаць** [гучна засмяяцца]. *...Ан-ну цяб-бе! – зарагатаў Недасек.* [Т. 1, с. 309].

Словы, што называюць гук сярэдняй гучнасці:

– **Загаманіць** [загаварыць]... *Кніжкі, кніжкі нясе! – загаманілі дзеці.*

Лексемы, якія абазначаюць слабое гучанне:.

– **Зашаптаць** [ціха прагаварыць]...[Цётка] *зашаптала цішэй.* [Т. 1, с. 31].

Таксама мэтазгодна правесці размежаванне дадзеных дзеясловаў па ступені працягласці дзеяння. Прааналізаваныя дзеясловы называюць:

а) шматразовае (працяглае) гучанне:

*бухукаць, пастукваць;*

б) аднаразовае (непрацяглае) гучанне:

*выдыхнуць, хмыкнуць.*

Нельга не заўважыць і такую асаблівасць дадзеных лексем стварэння гукавога фону, як магчымасць утварэння з іх сінанімічных радоў. Вылучым



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

два самыя самыя развітыя рады з семантычнымі ядрамі “гаварыць” і “смяяцца”.

– **Гаварыць**: *аблаяць, агрызнуцца, адсекчы, апраўдвацца, галаганіць*...

– **Смяяцца**: *зарагатаць, захіхікаць, ржаць*.

Увагі заслугоўваюць шматлікія кантэкстуальныя лексемы, якія ў выглядзе асобных семантычных адзінак, у адрыву ад кантэксту, нельга аднесці да моўных сродкаў стварэння гукавога фону:

– **Цягнуць** [тут: цягуча гаварыць]. ...*Уваходзіць ў хату* [чалавек] *і траскучым голасам цягне*... [Т.1, с. 14].

Такім чынам, ужыванне Я. Брылём гэтых лексем дазволіла зрабіць яго тэкст больш дынамічным, яскравым і мілагучным. Насычанасць твораў моўнымі адзінкамі стварэння гукавога фону выгадна адрознівае яго ад іншых пісьменнікаў.